загінуўшым у Вял. Айч. вайну, землякам-афганцам, авіяканструктару П.В.Сухому. Помнікі архітэктуры — касцёл і кляштар кармелітаў (1639—54), Троіцкі касцёл (1764—82), базыльянскі манастыр (1756—63), Ільінская царква (канец 18 — пач. 19 ст.), мемар. калона ў памяць Канстытуцыі 3 мая1791 (канец 18 ст.), будынкі 18—19 ст.: аўстэрыя (заезны дом, карчма), фрагменты жылой забудовы 2-й пал. 19—20 ст. па вуліцах Леніна і Маскоўская.

**ГЛЫБО́КАЯ РЫФМА**, від багатай (у большасці выпадкаў дакладнай) рыфмы, у якой супадаюць або з'яўляюцца сугучнымі не толькі націскныя склады, але і некалькі пераднаціскных гукаў: «небыццём — жыццём», «імкненне — імгненне», «ляском — пяском», «адкрыцця — жыцця», «рубіновыя — рубі новыя» і г.д. Вельмі часта Г.р. выкарыстоўваецца ў фальклоры, пераважна ў песнях, часам вельмі стараж. («Што доўга замуж не выдаваў, / Вялікага пасагу шкадаваў»). Сучасная паэзія таксама дае ўзоры Г.р.:

Такой журбою асвятлю,
З лістком пытлівым пафліртую
І адкажу табе: «... не сплю.
Паколькі твой спакой вартую».
(Я.Янішчыц «Савіная ноч»).

*І.М.Гоўзіч.*

**ГЛЫБОКІ ДРУК**, спосаб друку з выкарыстаннем друкаванай формы, на якой друкаваныя элементы паглыблены адносна прабельных. З'явіўся ў сярэдзіне 15 ст. Папярэднікам сучаснага спосабу вырабу форм Г.д. лічыцца геліягравюра (фотагравюра), якую вынайшаў чэшскі рысавальшчык і фатограф К.Кліч у 2-й пал. 19 ст. У 1910 пачаў выкарыстоўвацца ракельны Г.д., які характарызуецца механізацыяй друкавання на ратацыйных машынах. Формы выконваюцца пераважна фотамеханічным спосабам. Паглыбленыя друкуючыя элементы формы запаўняюцца фарбай вадкай кансістэнцыі, з прабельных яна выдаляецца тонкай ножападобнай пласцінай — ракелем. Глыбіня друкуючых элементаў розная: найбольшая адпавядае цёмным участкам арыгінала, нязначная — светлым. Г.д. выкарыстоўваецца гал. чынам для друкавання прадукцыі з вял. колькасцю поўтонавых выяваў: ілюстраваных часопісаў, фотаальбомаў, партрэтаў і інш.

**ГЛЫБОЦКАЯ КЕРАМІКА**, ганчарныя вырабы з г. Глыбокае. Найб. росквіту промысел дасягнуў у пач. 20 ст. Стваралі пераважна прадметы традыц. нар. побыту: гаршкі, макітры (гаршкі для расцірання маку), глякі, збаны, спарышы (двайчаткі) і г.д. Посуд адрозніваўся плаўнымі, акруг-